*Лёзненская ЦБС*
*бібліятэка аграгарадка “Якубаўшчына”*

# Летапіс



# Вёскі Якубаўшчына

**2013**

На сучасных картах магчыма ўбачыць толькі вёску Якубаўшчына, але мясцовым жыхарам добра вядома, што так спрадвеку называецца толькі паўднёвая частка населенага пункта. А вось паўночная частка традыцыйна мела назву Малькава. Чаму так? На гэтае няпростае пытанне можна адказаць, толькі зазірнуўшы ў далёкае мінулае, прасачыўшы гісторыю вёскі ад самага пачатку, вывучыўшы, як фармавалася яе тэрыторыя.

## ПАХОДЖАННЕ НАЗВЫ

Сёння ніхто дакладна не можа сказаць, калі ўзнікла вёска Якубаўшчына. Відавочна адно – гэта адбылося вельмі-вельмі даўно. Пра тое сведчыць багатая гісторыя населенага пункта і найперш – паданні пра паходжанне яго назвы.

Згодна з адным паданнем, быў у мясцовага пана селянін Якуб. Гаспадар яго вельмі цаніў, бо ён быў майстрам на ўсе рукі: даглядаў коней, завіхаўся ў кузні, нават лячыў людзей. Але вось бяда, селянін меў празмерна сварлівую жонку, якая не давала жыцця ні суседзям Якуба, ні нават самому пану. Пан не мог выгнаць свайго любімага селяніна толькі з-за жонкі, але і цярпець яе больш не мог, таму выселіў іх за вёску: даў надзел зямлі, дапамог пабудаваць хату. З тых часоў і пачалі сяляне называць тое месца Якубавай лагчынай, што паступова ператварылася ў Якубаўшчыну.

Ёсць яшчэ адно паданне. Кажуць, жылі ў адным безыменным паселішчы людзі. Усё б нічога, але панадзіўся прыходзіць сюды на кожнае Купалле злы чараўнік. З'явіцца, схопіць самую прыгожую дзяўчыну і знікне – шукай яго, дзе хочаш. Доўга цярпелі людзі. Лік загубленых дзяўчат пайшоў на дзесяткі. Нарэшце ўзбунтаваліся мясцовыя хлопцы на чале з Якубам: падпільнавалі злога чараўніка і забілі яго. З тых часоў больш ніхто не турбаваў вяскоўцаў, а безыменнае паселішча назвалі ў гонар вызваліцеля – Якубаўшчынай (1).

## XII – XVIII СТАГОДДЗІ

На карысць старажытнасці вёскі сведчаць і навуковыя даследаванні. Беларускі гісторык В. Насевіч адшукаў згадкі пра нашу мясцовасць у архіўных дакументах. Аказваецца, у XVI стагоддзі тут меліся цэлыя дзве вёскі: Якубаўшчына і Малкава. У 1567 г. гэтыя землі належалі шляхціцу Валовічу. Малкава (пазней яно стала называцца Малькавам) згадваецца ў дакументах 1593 г. (2).

Дзе ж знаходзіліся цэнтры дзвюх вёсак? Вызначыць гэта можна, дзякуючы матэрыяльным помнікам гісторыі.

Больш старажытнай, відаць, была вёска Малькава. Калі пахадзіць па вясковых палетках вясной ці восенню, то на зямлі можна назбіраць нямала

цікавых рэчаў, у прыватнасці – рэшткаў старажытнага посуду. Найбольш раннія з іх адносяцца аж да XII – XIII стагоддзяў. Датаваць іх дапамагла віцебскі археолаг Т.С. Бубенька. На фотаздымку бачна, што гліняныя пасудзіны мелі даволі тонкія сценкі, цікавыя загнутыя краі.



Рэшткі пасудзін XII – XIII стагоддзяў

Давялося знайсці кавалкі і больш позняга хатняга начыння. З такога посуду нашы продкі харчаваліся недзе ў XIV – XVIII стагоддзях.



Рэшткі пасудзін XIV – XVIII стагоддзяў

А яшчэ пашчасціла знайсці кавалкі ад старажытнай міскі. Яны ляжалі побач адно да аднаго, таму іх удалося склеіць паміж сабой. Вось што атрымалася.



Міска: выгляд зверху і збоку

Бачна, што жыхары старажытнага Малькава мелі добры густ. Нават такую звычайную рэч, як міска, яны ўпрыгожылі роспісамі ў выглядзе кветкі і хвалістых ліній. З такой пасудзіны самая звычайная каша будзе смачнейшай. Сама міска з унутранага боку была пафарбавана ў зялёны колер. Хаця з цягам часу амаль уся фарба абсыпалася, бачна, што яна калісьці была каляровай.

Дзякуючы такім знаходкам, можна вызначыць, дзе пасяліліся першыя жыхары Малькава.




Гістарычны цэнтр Малькава

На плане адлюстраваны месцы знаходак старажытнага посуду: лічбай 1 – высокае месца на беразе ракі (за будынкам вясковай бібліятэкі), 2 і 5 – агароды вяскоўцаў, 4 – школьны зямельны ўчастак. Месца для пасялення тут сапраўды было зручнае: з двух бакоў яно абгінаецца ракой. У рацэ можна было лавіць рыбу, плаваць у суседнія вёскі.

Яшчэ адной цікавай старажытнасцю Малькава з'яўляецца надмагільны помнік (на плане яго месцазнаходжанне пазначана лічбай 3). Сёння ён знаходзіцца акурат у цэнтры вёскі (на ўзвышаным месцы паміж будынкам калгаснага праўлення і школьным дваром), а раней мясціўся яўна ля мяжы паселішча. Помнік звернуты на ўсход і на ім высечаны чатырохканцовы крыж, над якім – нейкая крышачка з рожкамі. Па ўсёй верагоднасці, тут былі старажытныя могілкі Малькава.



Помнік на старых Малькаўскіх могілках

Свой старажытны цэнтр быў і ў Якубаўшчыны. Ён знаходзіўся недзе за паўкіламетра ад сучаснай паўднёвай мяжы вёскі. Зараз там – калгасныя палі. Як і палеткі вяскоўцаў колішняга Малькава, яны багатыя на археалагічныя

знаходкі. Найбольш цікавыя з іх – гэта каляровыя кавалкі гліняных пасудзін, аздобленыя спецыяльнай фарбай – глазурай. На месцы паселішча былі знойдзены самыя розныя: ярка- і балотна-зялёныя, прыглушана-чырвоныя, барвовыя. Археолагі сцвярджаюць, што зялёную і карычневую паліву нашы продкі актыўна выкарыстоўвалі з канца XV стагоддзя, блакітную, жоўтую, белую – з XVI стагоддзя (3).



Рэшткі пасудзін з старажытнага цэнтра Якубаўшчыны

Як і ў Малькаве, у Якубаўшчыне былі свае могілкі. Яны дзейнічаюць і зараз. Па сённяшні дзень там захавалася даволі шмат старых помнікаў, якія сведчаць, што вёска існуе ўжо даўно.









Старыя помнікі на Якубаўшчынскіх могілках

Звычайна гісторыкі датуюць такія помнікі XIV – XVIII стагоддзямі (4). На Якубаўшчынскіх могілках ёсць толькі адзін старажытны помнік, на якім высечана дата пахавання – 1785 г.



Помнік 1785 г.

Атрымліваецца, што калісьці на тэрыторыі сучаснай Якубаўшчыны было дзве асобныя вёскі, пры тым існавалі яны з даўніх часоў.

# XIX – ПАЧАТАК XX СТАГОДДЗЯ

У XIX – пачатку XX стагоддзя ў ваколіцах Якубаўшчыны і Малькава ўзніклі яшчэ і іншыя населеныя пункты, панскія маёнткі. Гаворка пра іх пойдзе не дарэмна: з цягам часу яны разам з Малькавам далучацца да Якубаўшчыны і будуць складаць адзіную вёску.

Некаторыя з гэтых маёнткаў і хутароў адлюстраваны на карце 1895 г.




Фрагмент карты 1895 г.

Так, на поўдзень ад Малькава, на высокім беразе рэчкі, з'явіўся маёнтак Малькава, на захад ад Якубаўшчыны – маёнтак Альхімкава. У 1895 г. у Малькаве было 13 двароў. Якубаўшчына была значна большай вёскай, тут налічвалася 24 двары.

Цікавыя звесткі пра гэтыя населеныя пункты маюцца ў "Спісе населеных месцаў Магілёўскай губерні" 1910 г. У прыватнасці, Малькава тады складалася з 27 двароў, дзе жыло 100 мужчын і 104 жанчын, Якубаўшчына – з 45 двароў (сярод сялян 190 былі мужчынскага полу і 193 – жаночага). Гаспадаром фальварка Малькава на той момант лічыўся дваранін Рэут. Ён меў больш за 70 га зямлі. У фальварку мелася 3 двары, 4 мужчын і 3 жанчыны. Альхімкаўскі памешчык С. Сліжаноўскі меў багацейшую гаспадарку. Яна складалася з 9 двароў, дзе жыло і працавала 19 мужчын і 22 жанчыны.

Акрамя таго ў "Спісе" згадваюцца маёнтак Гарадок, сядзіба Плаксіна. Гарадок мясціўся на паўднёвы захад ад Якубаўшчыны. Тут сельскім старастам лічыўся селянін Я. Сідараў. У маёнтку было 9 двароў, дзе жыло 75 чалавек (35 мужчын і 40 жанчын). Плаксіна размяшчалася на ўсход ад

Малькава і Якубаўшчыны. Гаспадаром сядзібы з’яўляўся селянін П. Кальмакоў. У 8 дварах пражывала 33 мужчыны і 30 жанчын (5).

Варта згадаць, што ў ваколіцах нашай вёскі таксама знаходзіўся хутар Сутокі (на поўнач ад Малькава).

## 1917 – 1930-Я ГАДЫ

Кастрычніцкая рэвалюцыя 1917 года ўнесла змены ў побыт вяскоўцаў. Маёнткі як такія зніклі, у сядзіб з’явіліся новыя гаспадары.

Напрыклад, у дакументах 1918 г. у якасці гаспадароў маёнтка Гарадок значацца Пруднікаў Іван Барысавіч і Дзегулёў Тарас Анастасьевіч (6).

Пра тое, на колькі павялічылася Якубаўшчына і прылеглыя да яе вёскі, сведчыць тапаграфічная карта, складзеная ў 1941 г. Але для яе падрыхтоўкі выкарыстоўваліся звесткі 1923 г. Значыць, у 1923 г. у Якубаўшчыне было 57 сялянскіх двароў, у Малькаве – 35, у Плаксіне – 12, у Гарадку – 30 (7).




Фрагмент карты, складзенай паводле звестак на 1923 г.

* * *

У маёнтку Альхімкава пасля рэвалюцыі быў арганізаваны аднайменны саўгас. Але справы ў саўгасе ішлі не вельмі добра, таму жыхары вёскі Якубаўшчына вырашылі ўзяць ініцыятыву ў свае рукі і 6 снежня 1922 г. напісалі валасному кіраўніцтву ліст, у якім прасілі аддаць ім у карыстанне саўгасныя землі. Вось што пісалі сяляне ў сваім лісце: "Мы грамадзяне в. Якубаўшчыны ёсць радавыя нашчадкі ўсіх былых уладанняў гэтай вёскі. Зямля ж, якая знаходзіцца ў нашым карыстанні, сваім межамі прылягае да зямлі былога маёнтка, а цяпер саўгаса "Альхімкава". З-за густаты насельніцтва нашай вёскі, беззямелля і малазямелля, мы і нашыя продкі ўсё сваё жыццё аблівалі потам зямлю гэтага маёнтка, працуючы за нікчэмныя грошы на памешчыка, каб здабыць сабе неабходны кавалак хлеба для харчавання. Але вось пачалася рэвалюцыя, пачулі мы пра звяржэнне манархізма, затым – кадэцкага часовага ўраду. Надышла ўлада наша – Рабочых і Сялян. З-за помсты памешчыку чутна было пра разгромы былых маёнткаў. Забіралі сяляне і рабочыя ўвесь жывы і мёртвы інвентар маёнтка. Канечне, гледзячы на гэта, і мы, напэўна ўзялі б прыклад з тых сялян і падверглі б гэтакаму ж разбурэнню гэты маёнтак. Але дзякуючы свядомасці большасці насельніцтва нашай вёскі, мы вырашылі не разбураць яго, бо яно нажывалася нашым потам на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Жадаючы, каб наша праца захоўвалася вечна, мы вырашылі увесь узяты жывы і мёртвы інвентар гэтага маёнтка абвясціць маёмасцю Агульнага Народнага Здабытку Рэспублікі. Каб гэты маёнтак служыў рассаднікам Культуры, якая вядзе нас да камунальнага жыцця. Што ж мы ўбачылі. З кожным годам, нягледзячы на неаднаразовую дапамогу насенным фондам з боку Губпрадкама, пасяўная плошча стала скарачацца. Лугі, як і раней, скошваліся нашымі сіламі толькі не на тых умовах. Пры памешчыку мы за ўборку лугоў бралі палову атрыманага ўраджаю травы з дзесяціны, а пры саўгасе 1/3, і 2/3 – на карысць саўгаса. І то з накошаным нашымі рукамі сенам адміністрацыя саўгаса не магла распарадзіцца. Сена гніло на лугах у раскіданых скірдах, а жывёла памірала ў хлявах ад голаду, нягледзячы на вялікія плошчы лугоў у гэтым саўгасе. І давялі да таго, што да цяперашняга часу, гэта значыць 5 снежня цякучага году, з пасяўной плошчы азімых пасеваў 22 дзесяціны скарацілася да 3 дзесяцін, а яравых - з 50 дзесяцін да 5 – 6 дзесяцін. Канюшыну і іншыя травяністыя расліны не сеюць. А той яравы хлеб ляжыць яшчэ на палях не прыбраны. З жывёлы ад 200 галоў рагатай засталося паўжывых 13, ад 40 коней засталося 2 і тыя хворыя…".

Усяго ў саўгасе можна было апрацоўваць больш за 140 га ворыва, таксама мелася каля 320 га лугоў і няўдобіцы.

Жыхары Якубаўшчыны прасілі мясцовыя органы ўлады перадаць ім у карыстанні гэтую зямлю. У архіўных дакументах захаваліся імёны тых сялян. Гэта Аляксандр Прасвяшчэннікаў, Міхаіл Кавалёў, Іван Драздоў, Аўдзей Кукушкін, Пётр Варанцоў, Сцяпан Кавалёў, Емяльян Кавалёў, Лявон Бізункоў, Парфен Іваноў, Пётр Іваноў, Захар Іваноў, Емяльян Скрыпялёў, Піліп Кукушкін, Фёдар Несцярэнка, Дзям'ян Курчанкоў, Іван Кавалёў,

Сцяпан Мяшкоў, Кірыл прасвяшчэннікаў, Максім Шарандзін, Аляксандр Краўцоў, Мікіта Бычкоў, Ігнат Шарандзін, Іван Рымш, Каліна Краўцоў, Васіль Бізункоў, Фама Лабзоў, Аркадзь Кукушкін, Сцяпан Фраленка, Яўген Вішнякоў, Улляна Курчанкова, Пётр Несцярэнка, Ягор Мяшкоў, Сцяпан Вішнякоў, Пётр Кібароў, Анісім Салаўёў, Іван Пурман, Кліменцій Марозаў, Маісей Бізункоў, Аляксей Іванюшын, Трапон Краўцоў, Аляксандр Кукушкін, Сафія Варанцова, Іван Варанцоў, Карп Краўцоў, Палікарп Краўцоў і Сцяпан Бізункоў.

16 сакавіка 1923 г. Віцебскае губернскае зямельнае ўпраўленне заключыла з гэтымі сялянамі дамову. Ім перадаваліся ўгоддзі саўгаса "Альхімкава", а менавіта: 137 га ворыва, 3 га зямлі пад сядзібай, 2 га пад садам і гародам, 38 га сухадольнага луга, 22 га заліўнога луга, 30 га забалочаных земляў, а таксама 22 га заліўнога луга ва ўрочышчы Поплава на рэчцы Страгоўка.

Акрамя таго сялянам з Якубаўшчыны дастаўся былы панскі сад, дзе расло 287 яблынь, 18 драўляных жылых і гаспадарчых пабудоў і жывёла (2 кані, 14 кароў, 1 баран, 15 авечак, 2 свінні).

Дамовай прадугледжвалася, што сяляне будуць карыстацца гэтай гаспадаркай да 16 сакавіка 1931 г., але атрымалася іначай. 30 красавіка 1925 г. у Альхімкава прыехала праверка з раёна. Яна заўважыла, што "ў сельскагаспадарчым таварыстве працуе 26 гаспадарак, з якіх жыве ў таварыстве 17. Зямлі ўсёй маецца 169 дзесяцін… Карыстанне зямлёй цераспалоснае, размеркавана паміж едакамі. Тыя, хто пражывае ў Альхімкаве і маюць зямлю, сабраны ўраджай прывозяць у саўгас, а тыя, хто жыве ў сваіх гаспадарках, па-за межамі саўгаса, сабранае вязуць дадому. Жывёла стаіць у кожнага паасобку. Сад не прыведзены ў парадак, не ажыццёўлена абрэзка галля і яблыні не абкапаныя. Тэрыторыя ў садзе размеркавана пад агароды кожнаму паасобку…Рамонт пабудоў не праводзіўся. Ёсць шмат старых будынкаў…". Адным словам, правяраючы зрабіў выснову, што сяляне вядуць аднаасобныя гаспадаркі, ніякага калгаса тут няма. Натуральна, камісія была незадаволена ўбачаным. Летам 1925 г. сяляне вымушаны былі перабрацца з Альхімкава назад у Якубаўшчыну (8).

* * *

На месцы маёнтка Малькава таксама быў створаны калгас. Але не так хутка, як гэта было ў Альхімкаве.

Апошнім уладальнікам маёнтка Малькава з'яўляўся Уладзімір Карлавіч Блюм. Перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй 1917 г. яго ўладанні ахоплівалі 65га зямлі. Побач з двухпавярховым жылым домам знаходзіўся вялізны сад, плошчай каля 3 га. Пасля рэвалюцыйных падзей пан кудысьці знік (мабыць, знаходзіўся пад судовым следствам) (9). Пакуль ён адсутнічаў, у яго доме размясцілася Малькаўская пачатковая школа, дзе адной з настаўніц стала працаваць жонка былога пана. А недзе ў 1919 г. вярнуўся і сам У.К. Блюм. Разам з жонкай і дачкой яны сталі трымаць немалую гаспадарку: 7 кароў, 6 авечак і 3 кані. Натуральна, для апрацоўкі зямлі і

догляду за жывёлай ім даводзілася наймаць работнікаў (10). У 1925 г. уся сям'я пана была выселена з Малькава. Панскі сад было вырашана здаць у арэнду, а ўсе будынкі і рухомую маёмасць – прадаць (11).

Былой панскай сядзібе не давялося доўга пуставаць. Ужо ў маі 1925 г. тут узнікла сельскагаспадарчая арцель "Першае Мая". Яе членамі было 10 сялянскіх сем'яў з Бржазова, Яськаўшчыны. Але нас цікавяць толькі ўраджэнцы Малькава і Сутокаў. Так, у спісе членаў арцелі на 12 чэрвеня 1925 г. ёсць імёны сялян з Сутокаў: Сідорскія Яфім Васільевіч, Улляна Пятроўна і Уладзімір Яфімавіч, з Малькава: Шаўцовы Марк Ігнатавіч, Фяўронння Сцяпанаўна і іх дзеці Павел, Кацярына і Мікалай, а таксама брат Марка Ігнатавіча Сяргей. З Малькава былі і Драздоў павел Кірэевіч, Емяльянкіны Мікіта Карпавіч ды Платон Карпавіч.

На той момант у арцелі было 30 га ворыва, 17,5 га лугоў, 10 га іншай прыдатнай да апрацоўкі зямлі, 7 га лесу, а таксама сад. Сяляне даглядалі жывёлу: 7 коней (4 працаздольных і 3 маладых), 11 кароў, 5 цялушак, 11 свінняў.

21 чэрвеня 1925 г. у арцелі здарыўся пажар, у выніку якога згарэў жылы дом і ўсе пабудовы, якія знаходзіліся каля яго. Арцель не паспела цалкам аднавіцца, як у ноч з 9 на 10 лютага 1927 г. адбыўся яшчэ адзін пажар. Тады згарэлі пуні з усім сенам.

Сяляне паступова адбудаваліся: наладзілі сабе 5 жылых хат, стайню і хлявы для жывёлы, пуню, вазоўню, еўню. У 1928 г. тут працавала 6 сем'яў (33 чалавекі, з якіх працаздольных было 23). З жывёлы ў "Першым Маі" мелася 10 дойных кароў, 1 бык, 3 гадавалыя цялушкі, 11 авечак, 18 свіннняў, 10 коней, 30 курыц. З сельскагаспадарчага інвентару ў сялян была 1 конная малацілка, веялка, жнейка, 2 плугі на 2 кані і 2 на 1-го, 1 спружынная барана, 3 вазы, 4 санак, 1 дзесяціведзерны сепаратар.

Да 1929 г. зямельныя ўгоддзі арцелі пашырыліся. Ворыва займала 44 га, луг – 27 га, парк – 10 га. Цяпер тут працавала 10 сем'яў, якія налічвалі 39 чалавек (з іх 20 былі дарослымі, 2 – падлеткамі, 17 – непрацаздольнымі). Пашырыўся і статак. У калгасных хлявах стаялі 21 карова, 2 быкі, 3 цялушкі, 20 авечак, 17 свінняў, 35 курыц, 6 коней. Сярод пабудоў было 7 жылых хат, 6 хлявоў, 5 пуняў, 2 амбары, 2 вазоўні, 2 лазні, 3 еўні. Вырошчвалі першамайцы авёс, пшаніцу, ячмень, лён, бульбу, віку, канюшыну (12).

Жыхары Малькава, па ўсёй верагоднасці, былі цалкам задаволены сваім жыццём і гаспадаркай, затое зямлі хапіла не ўсім сялянам з Сутокаў. Нездарма ў ліпені 1927 г. некаторыя з іх задумалі перабрацца ў Сібір, каб там атрымаць вялікі зямельны надзел. Вось прозвішчы тых, хто выказаў жаданне перасяліцца: Сідорскі Міхаіл Сямёнавіч, Сідорскі Фрол Васільевіч, Сычоў Іосіф Несцеравіч, Сідорскі Павел Сямёнавіч і Сідорскі Яфім Васільевіч. Для сваёй мэты яны нават арганізавалі перасяленчае таварыства "Адзінства" (13).

* * *

Архіўныя дакументы сведчаць, што ў 1920-я гг. колькасць насельніцтва ў нашых вёсках пастаянна павялічвалася. Вось звесткі са “Спіса населеных пунктаў па раёнах Віцебскай акругі з пазначэннем колькасці гаспадарак і складу насельніцтва за 1926 – 1927 гг.”.

У гэты час Якубаўшчына мела статус хутара. Тут налічвалася 71 гаспадарка, 322 чалавекі (160 мужчын і 162 жанчыны). Паводле нацыянальнасці 69 сямей былі беларускімі, 1 – яўрэйская, а нацыянальнасць яшчэ адной вызначыць не ўдалося.

На хутары Малькава меўся 41 двор. Пражывала тут 219 сялян: 100 мужчын і 119 жанчын. 37 гаспадарак былі беларускімі, 1 – рускай, 1 – польскай і 2 – нявызначанай нацыянальнасці.

На тэрыторыі сельскагаспадарчай арцелі “Першае Мая” (былы маёнтак Малькава) знаходзілася 6 двароў. У арцелі працавала 11 мужчын і 8 жанчын (усяго – 19 чалавек). 5 сямей было беларускімі, 1 – нявызначанай нацыянальнасці.

Сельскагаспадарчая арцель “Чырвоны Кастрычнік” (былы маёнтак Альхімкава) была трошкі большай за “Першае Мая”. Тут налічвалася 8 двароў, 31 селянін (14 мужчын і 17 жанчын). Паводле нацыянальнасці, сялянскія сем’і размеркаваліся наступным чынам: 2 беларускія, 1 руская і 5 яўрэйскіх.

Хутар Сутокі складаўся з 13 двароў, дзе пражывала 68 чалавек (мужчын і жанчын было пароўну – па 34). У Сутоках жылі выключна беларусы.

Плаксіна ў 1926 – 1927 гг. мела статус вёскі. На яе тэрыторыі знаходзілася 17 двароў. З 78-мі вяскоўцаў 40 было мужчын, 38 – жанчын. Як і ў Сутоках, тут жылі толькі беларусы.

На хутары Гарадок у гэты час налічвалася 22 двары, 108 чалавек насельніцтва (49 мужчын і 59 жанчын). Усе яны былі беларусамі (14).

Зусім па-знаёмаму гучаць прозвішчы сялян, якія жылі ў гэтых вёсках, бо і зараз іх нашчадкаў можна сустрэць на вуліцах Якубаўшчыны. Так, у Сутоках у 1929 г. 9 сямей мелі прозвішча Сідорскі. Таксама тут жылі Малюковы. У Малькаве жылі Бабуровы, Даньковы, Драздовы, Емяльянкіны, Круковы, Мізуровы, Новікавы, Плаксіны, Савікавы, Салаўёвы, Сяргушкіны, Церахавы (15).

## 1940-Я -1980-Я ГАДЫ

Мірнае жыццё вяскоўцаў было парушана Вялікай Айчыннай вайной. Яна прынесла з сабой жахлівыя падзеі. Многія жыхары вёсак былі забіты, самі вёскі спалены.

Падобны лёс напаткаў і Якубаўшчыну. У кастрычніку 1943 г. населены пункт быў цалкам спалены. Яе ўцалелыя 280 жыхароў засталіся без жылля (16).

Вайна, а таксама пасляваеннае ўзбуйненне калгасаў прывялі да таго, што шматлікія хутары былі сселены ў дзве вёскі. Засталіся існаваць толькі Якубаўшчына і Малькава. Цяпер тут жылі сяляне з Сутокаў, Плаксіна, Гарадка, Альхімкава.

Паступова Якубаўшчына злілася с суседнім Малькавам і неўзабаве яны зрабіліся адной вёскай. У 1973 г. населенаму пункту афіцыйна была прасвоена адзіная назва – Якубаўшчына, а Малькава як бы перастала існаваць. Вось як пра гэта было запісана ў “Рашэнні выканаўчага камітэта Лёзненскага раённага Савета дэпутатаў працоўных ад 17 сакавіка 1973 г. №57”: “У сувязі з тым, што асобныя населеныя пункты раёна сселеныя ў перспектыўныя і некаторыя зліліся з іншымі населенымі пунктамі, выканаўчы камітэт раённага Савета дэпутатаў працоўных вырашае прасіць выканкам Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў працоўных зняць з дзяржаўнага ўліку … населены пункт Малькава Яськаўшчынскага с/с, які зліўся з населеным пунктам Якубаўшчына Яськаўшчынскага с/с, пакідаючы назву Якубаўшчына” (17).

Такім чынам, цяпер на картах можна ўбачыць толькі Якубаўшчыну. Вось фрагмент тапаграфічнай карты, складзенай паводле здымкі 1960 – 1962 гг., і абноўленай у 1981 г. Вёска – даволі вялікая, нескладана здагадацца, што ў хатках, якія стаяць на самай поўначы вёскі, жывуць нашчадкі жыхароў Сутокаў, а з паўднёвага захаду да Якубаўшчыны падсяліліся сяляне з Альхімкава і Гарадка. На карце пазначана і колькасць жыхароў Якубаўшчыны – 380 чалавек.

Фрагмент тапаграфічнай карты 1981 г.




## СУЧАСНАСЦЬ

Паводле звестак на 2003 г., у Якубаўшчыне пражывала 315 чалавек. Вёска складалася з 127 двароў (18).

## Спіс выкарыстаных крыніц і літаратуры


1) У каждого названия своя история // Сцяг Перамогі. – 2005. – 6 верасня. – С. 4.

2) Вялікі гістарычны атлас Беларусі. Том 1. Рэдкал.: Кузняцоў Г.І. (старш.) [і інш.]. – Мінск: Белкартаграфія, 2009. – С. 111, 221, 244.

3) Археалогія і нумізматыка. Энцыклапедыя. Мінск: “Беларуская энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 1993. – С. 478.

4) Археалогія Беларусі. Том 4. Помнікі 14 – 18 стст. Мінск: Беларуская навука, 2001. – С. 234 – 235.

5) Список населённых мест Могилёвской губерніи. Санкт-Петербург. 1910.

6) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 144, вопіс 1, справа 27, аркуш 61.

7) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 160, вопіс 5, справа 6, аркуш 133.

8) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 160, вопіс 13, справа 6, аркушы 27 – 28, 30, 36 – 37, 54, 59.

9) Успаміны жыхароў вёскі Малькава, запісаныя вучнямі каля 1963 г.

10) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 221, вопіс 1, справа 15, аркуш 24.

11) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 71, вопіс 1, справа 361, аркуш 67.

12) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 160, вопіс 13, справа 17, аркуш 2 – 4, 26 – 27.

13) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 71, вопіс 1, справа 914, аркуш 2.

14) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 118, вопіс 1, справа 729, аркушы 137 – 145.

15) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 160, вопіс 11, справа 30, аркушы 105 – 106.

16) Сцяг Перамогі. – 2000. – 17 кастрычніка. – С. 4.

17) Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці, фонд 160, вопіс 3, справа 367, аркуш 28.

18) Беларуская энцыклапедыя. Том 18. Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 2004. – С. 256.